

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Піншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны



## 75 год з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

1944 - 2019

Пінск, 2019

## Нашчадкам

Дзень  вызвалення Беларусі -
Вялікай Перамогі дзень.
І кветкі летнія на лузе
Цвілі святочна для людзей.

Былі навокал папялішчы
І партызанскі лес тужыў:
- Шкада байцоў, што вораг знішчыў,
Бо я ім кожным даражыў.

І праз гады той адгалосак,
Як напамін у мірны час.
Герояў мала засталося,
Але яны даюць наказ:

- Заўжды любі сваю Радзіму,
Прыгожую, як майскі сад!
І ў небяспечную гадзіну
Не дай загінуць ёй, салдат!

Т. Лазнюха

# Ішла вайна народная

*(1941-1945)*

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачала вайну супраць СССР, якая для савецкага народа стала Вялікай Айчыннай вайной. Вораг меў значную перавагу ва ўзбраенні і амаль у два разы ў жывой сіле. Савецкія войскі ўступалі нямецка-фашысцкай арміі па аснашчанасці новымі танкамі, самалётамі, артылерыяй. Перад вермахтам стаяла задача разграміць Чырвоную армію і за паўтара месяца закончыць вайну. Гэтага нямецкія войскі павінны былі дабіцца, выкарыстаўшы фактар удару знянацку, а таксама акружэннем рассечаных груповак савецкіх войскаў. На тэрыторыі Беларусі наступала нямецкая група армій “Цэнтр” у складзе 4-й 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп, усяго 50 дывізій. Іх падтрымліваў 2-і паветраны флот – 1600 баявых самалётаў.

З савецкага боку ім супрацьстаялі 3,10 і 4-я арміі. У паласе абароны 4-й арміі вораг меў перавагу ў жывой сіле больш чым у пяць разоў, амаль у тры разы ў танках, артылерыі, у два разы ў авіяцыі.

Першымі ўдар на сябе прынялі пагранічнікі Заходняй дзяржаўнай граніцы ў раёне Брэста і воіны 4-й арміі. Падзеі на фронце складваліся трагічна для савецкага боку, войскі неслі вялікія страты. Толькі ў першы дзень вайны праціўнік знішчыў 738 самалётаў і за тры тыдні прасунуўся на цэнтральным напрамку Брэст – Мінск – Масква па тэрыторыі Беларусі на 600 кіламетраў.

Суровы подых вайны жыхары Піншчыны адчулі ў першы ж дзень. Побач з в. Жабчыцы, у 5-6 кіламетрах ад Пінска, быў ваенны аэрадром, дзе базіраваўся 39-ы бамбардзіровачны полк, аператыўна падначалены штабу 4-й арміі. Нямецкае камандаванне было добра інфарміравана аб савецкіх аэрадромах, і таму аэрадром у Жабчыцах немцы бамбілі ў першыя ж гадзіны вайны. Большая частка самалётаў згарэла, але сам аэрадром застаўся прыгодным для выкарыстання. Каля 6 гадзін раніцы была праведзена авіяразведка над Бугам, што дазволіла выявіць месцы нямецкіх пераправаў.

У раёне Пінска акрамя авіяцыйнага палка знаходзіліся адзін з палкоў артылерыі 28-га стралковага корпуса 4-й арміі і акруговы артылерыйскі склад. Склад быў моцна пашкоджаны ў час налёту нямецкіх самалётаў, гэта ў значнай ступені адбілася на забеспячэнні артылерыстаў боепрыпасамі.



Пінская ваенная флатылія



Бронякатэр №15 у паходзе



Манітор “Удачный”



Флатылія адпраўляецца ў паход

У Пінску размяшчаўся штаб Пінскай ваеннай рачной флатыліі, якая складалася з атрада глісераў, групы кананерскіх лодак, дывізіёнаў бранякатэраў, манітораў, тральшчыкаў, а таксама вартавых караблёў, міннага загараджальніка і зенітнага артылерыйскага дывізіёна.

24 чэрвеня, пасля няўдалай спробы звязацца са штабам 4-й арміі, караблі флатыліі занялі абарону на захадзе ад Пінска і да 5 ліпеня разам з адступаючымі часцямі арміі і Пінскім знішчальным батальёнам, вялі абарончыя баі. Праз Пінскі раён на ўсход адыходзілі 22-я танкавая дывізія (камадзір І.В.Конанаў) і 205-я матарызаваная дывізія (камадзір Ф.Ф.Кудзюраў), асобны атрад палкоўніка Ф.А.Асташанкі і інш.

У першыя дні вайны ніхто не мог падумаць, што фашысты змогуць так далёка ўглыбіцца ў тэрыторыю краіны. Многія, у тым ліку і ваенныя, разглядалі авіяналёты, артабстрэл савецкай тэрыторыі раніцай 22 чэрвеня як правакацыю з боку немцаў, на якую ні ў якім разе нельга было паддавацца. Наконт гэтага было ўказанне вышэйстаячага ваеннага начальства. Але падзеі якія разгарнуліся, пераканалі ў іншым.

Чырвоная армія ўпарта супраціўлялася. Але пераўзыходзячы па сіле вораг хутка рухаўся на перад. У напрамку Пінска вораг рухаўся не так хутка, горад не меў такога стратэгічнага значэння, як Мінск. Часці нямецкага армейскага корпуса набліжаліся да горада Пінска. 27 чэрвеня былі здадзены суседнія з Пінскам райцэнтры Іванава і Лагішын.

У баі з фашыстамі ўступалі і байцы Пінскага знішчальнага батальёна пад камандаваннем В.З.Каржа, які быў створаны ў Пінску ў першы ж дзень вайны і кантраляваў паўночныя падыходы да горада. Вялікіх абараняючых баёў на тэрыторыі раёна ў 1941 годзе не было. У Чырвонай арміі для гэтага было недастаткова сіл.



Ваенны аэрадром каля в. Жабчыцы

“…З-за адсутнасці боепрыпасаў вымушаны быў пакінуць 5 ліпеня горад”, - пісаў у данясенні камандарму генерал С.І.Нядзвігін. Мужна змагаліся з ворагам савецкія лётчыкі. Да 25 чэрвеня з Жабчыцкага аэрадрома падымаліся ў паветра бамбардзіроўшчыкі: самалёты 39-га палка вылятаі на згішчэнне ворага, наносілі ўдары па яго калонах, якія рухаліся на Маскву.

Ворагу, які ўступіў на тэрыторыю сучаснага Пінскага раёна 27 чэрвеня спатрэбілася амаль два тыдня, каб поўнасцю ўсталяваць тут свой кантроль.







Пінскія партызаны



# Падполле

З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны ЦК КП(б) Б узяў пад кантроль арганізацыю антыфашысцкага падполля, партызанскіх атрадаў, дыверсійных груп. У канцы ліпеня 1941 г., трымаючы справаздачу перад ЦК КП (б)Б аб дзейнасці ў гэтым кірунку, сакратар Пінскага абкома партыі А.М. Мінчанка паведамляў, што ў Пінскай вобласці былі створаны два цэнтры падпольнага абласнога камітэта – Сталінскі і Ленінскі, якія ўзначальвалі П.Г.Шапавалаў і Сарокін.

Стварэнне падполля ў Пінскай вобласці пачала першы сакратар Пінскага абкома ЛКСМБ В.А.Сысоева. У восень 1943 года ў Пінскім раёне ўжо дзейнічала 28 падпольных і 5 антыфашысцкіх арганізацый. Адну з іх у в. Хлябы ўзначаліў А.К.Ключыц. Антыфашысцкая арганізацыя ў в.Лапацін на чале з Г.І.Самуйлікам займалася прапагандысцкай работай, збірала нямецкія лістоўкі, адозвы, аб'явы для адпраўкі іх на Вялікую зямлю.

Актыўнай і баяздольнай паказала сябе Курадаўская падпольная арганізацыя, сакратарамі якой былі Ф.М.Сачкоўскі і М.А.Палхоўскі. Яе члены праводзілі палітмасавую работу сярод насельніцтва, знішчылі 4 масты, разбуралі тэлефонную сувязь, збіралі зерне ў фонд наступаючай Чырвонай арміі. Цесна супрацоўнічалі падпольшчыкі Лагішынскага раёна з партызанскай брыгадай імя В.В.Куйбышава. Член падпольнага Лагішынскага РК ЛКСМБ А.А.Самахвалаў успамінаў, што адна з найбольш баяздольных і моцных падпольных камсамольскіх арганізацый дзейнічала ў в.Бобрык. Кіраваў ёй У.Е.Кахновіч.

Актыўнай была группа ў Парэччы на чале з Уладзімірам і Паўлам Хвесюкамі. Абодва яны былі накіраваны ў варожы тыл для арганізацыі падпольнай работы ў пачатку жніўня 1941 г. Дзякуючы намаганням падпольшчыкаў, якія ў ліпені 1944 г. дзейнічалі сумесна з Чырвонай арміяй, в. Парэчча была выратавана ад знішчэння. Амаль 30 падпольных груп дзейнічалі на тэрыторыі Жабчыцкага раёна ў вёсках Мерчыцы, Палтаранавічы, Выжлавічы, Лісяцічы, Малы Халажын, Малоткавічы. Вясковыя камсамольцы былі незаменнымі праваднікамі для партызан.



Члены Пінскага абкома камсамола (злева направа) першы сакратар А.А.Бірукоў, другі сакратар П.А.Емяльянаў, сакратар Э.Б.Нордман

У час “рэйкавай вайны” яны праводзілі іх да чыгункі, мастоў, іншых варожых аб’ектаў. Камсамольцы разам з партызанамі ўдзельнічалі ў шматлікіх аперацыях: грамілі гарнізоны праціўніка ў вёсках Хойна, Жабчыцы, Ахова, зрывалі вываз моладзі на прымусовыя работы ў Германію. За кошт моладзі папаўняліся рады партызан.

“Запарожцы” – так назвала сваю падпольную групу моладзь вёскі Купяцічы. На баявым рахунку групы 26 аперацый: тры пушчаныя пад ахон варожыя эшалоны, узрывы на нямецкай пошце і запалкавай фабрыцы ў Пінску, на Гарадзішчанскай фабрыцы, падрыў нямецкіх танкаў і аўтамашын.

Дзеянні падпольшчыкаў-антыфашыстаў зліваліся з партызанскай барацьбой у адзіны нябачны фронт у тыле ворага. Сумеснымі намаганнямі яны набліжалі час перамогі.



Група камсамольцаў-падпольшчыкаў Піншчыны (злева направа) М.Е.Ключыц, В.М.Буката і яго жонка А.Буката, М.Сергіевіч



Удостоверение
Дано гр-ну Ключиц Александр Константинович
в том что он действительно является
в/з ним. и участвовал в бою в колод.
Морозовичи 3/I 43 г. который свободным
каком количестве противник и сам
без оружия шел в переди
результате чего победа оста-
ась за партизанами.
Ком п/о им Сталина Моряк

Пасведчанне, выдадзенае А.К.Ключыцу аб яго ўдзеле ў партызанскім руху



# Партызанскі фронт на Піншчыне


В.З. Корж

З першых дзён вайны ў Пінску пачалася падрыхтоўка да барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ужо 22 чэрвеня 1941 года па прапанове загадчыка фінансавага сектара абкома В.З.Каржа пачалася работа па арганізацыі знішчальнага батальёна, які потым ператварыўся ў партызанскі атрад. В.З.Корж быў вопытны баец і падпольшчык. Ён удзельнічаў у партызанскім руху ў Заходняй Беларусі, вайне 1926-1939 гг. у Іспаніі.

Першымі ў атрад уступілі работнікі Пінскага абкома КП (б)Б Р.С.Карасёў, С.Г.Карнілаў, В.З.Харужая, Ф.І.Палажэнцаў, камсамольскія кіраўнікі Ш.І.Бярковіч, М.А.Ласута, Э.Б.Нордман, а таксама П.С.Хацімчанка, І.І.Чуклай, В.М.Ліфанцьеў, Ф.С.Кунькоў, І.А.Некрашэвіч і іншыя. Усяго каля 60 чалавек. Атрад падзялілі на тры групы па 20 байцоў.

Атрад атрымаў загад абараняць Пінск. Ён выконваў задачы знішчальнага батальёна: выяўляў і знішчаў фашысцкіх дыверсантаў, ахоўваў стратэгічныя аб’екты, удзельнічаў у эвакуацыі людзей і каштоўнасцей на ўсход.

Вораг імкліва рухаўся на ўсход. 28 чэрвеня атрад Камарова (псеўданім В.З.Каржа) зрабіў дзве засады. На адну з іх на Лагішынскім тракце наскочылі дзве нямецкія танкеткі. Гэта была разведка 293-й пяхотнай дывізіі вермахта. У кароткім баі яны былі знішчаны разам з экіпажамі. Гэты бой каля вёскі Пасянічы стаў баявым хрышчэннем атрада. У памяць аб ім на месцы бою ў 1986 г. установлены мемарыяльны знак. Другі бой атрада Каржа адбыўся 4 ліпеня ў трох кіламетрах ад Пінска, у раёне вёскі Галева. Атрад В.З.Каржа – адзін з нешматлікіх, што здолеў, нягледзячы на складаны перыяд фарміравання, захавацца арганізацыйна, забяспечыць рост сваіх радоў, накапіць баявы вопыт, стаць з часам пагрозай для ворага. У гэтым была заслуга яго камандзіра.



Ён наладзіў у атрадзе жалезную дысцыпліну, падтрымліваў высокі маральны дух людзей. Умела манеўруючы, пераходзячы з раёна ў раён, атрад выстаяў, знайшоў падтрымку ў мясцовага насельніцтва. Усё гэта дазволіла партызанам перажыць зіму 1941-1942 гг.

Вясной і летам 1942 г. атрад Камарова пашырыў зону свайго дзеяння. У маі группа арганізатараў была накіравана ў Лунінецкі раён. У склад групы ўвайшлі надзейныя людзі – А.П. Савіцкі, Ф.І.Лісовіч, Р.С.Карасёў. Там яны аб'ядналі асобныя групы ў партызанскі атрад імя С.М.Кірава. Такая ж работа праводзілася ў Баранавіцкім, Лагішынскім і іншых раёнах. У гэты час рады партызан павялічыліся за кошт выходзячых з акружэння чырвонаармейцаў. Удары партызан па ворагу ўзмацняліся з кожным днём.

Для далейшага развіцця партызанскага руху і ўмацавання партыйнага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б аднавіў у жніўні 1942 г. Пінскі падполны абком партыі. У верасні 1942 г. з савецкага тылу прыбыў член абкома А.Я.Кляшчоў, ён жа ўпаўнаважаны ЦК КП(б) па Пінскай вобласці.

Падпольны абком партыі за кароткі час устанавіў сувязь з падпольнымі арганізацыямі і партызанскімі атрадамі. Са снежня 1942 г. па верасень 1943 г. у вобласці стварыліся раённыя партыйныя арганізацыі. Пачалі дзейнічаць адзінаццаць райкомаў, сярод іх Пінскі, Жабчыцкі, Целяханскі, Лагішынскі. У лістападзе 1942 г. Пінскі падпольны абком КП(б) Б з аб'яднаных атрадаў стварыў партызанскае злучэнне вобласці. Яго камандзірамі былі В.З.Корж, А.Я.Кляшчоў, начальнік штаба злучэння – М.С.Фядотаў.

На базе арганізацыйнай групы Ф.С.Кунькова быў створаны міжраённы штаб для каардынацыі дзеянняў партызанскіх сіл у падкантрольных яму раёнах. Аб'яднаныя атрады стварылі партызанскую брыгаду імя В.М.Молатава. Ужо ў студзені 1944 года ў вобласці дзейнічала 7 партызанскіх брыгад і адзін асобна дзеючы атрад. Колькасць партызан у гэты час дасягала дзвюх тысяч чалавек. Кожная брыгада катралявала 1-2 раёна. У Пінскім і Жабчыцкім раёнах дзейнічала Пінская партызанская брыгада.

Акрамя Пінскай брыгады і брыгады імя В.У.Куйбышава на тэрыторыі Пінскага раёна дзейнічала брыгада імя С.М.Кірава, "Савецкая Беларусь", імя В.М.Молатава, а таксама 8-я, 99-я імя Дз.Ц.Гуляева, 150-я імя В.М.Языковіча, якія былі перадыслацыраваны ў заходнія вобласці рэспублікі з усходніх, асобныя атрады і атрады спецпрызначэння: 208-ы асобны партызанскі полк; 200-ы, 550-ы, імя Ф.Э.Дзяржынскага, імя Тэльмана, Целяханскі, НКДБ "Храбрацы" і іншыя.

Партыйныя і камсамольскія органы разгарнулі масава-палітычную работу сярод партызан і насельніцтва. У сваёй рабоце партызанскія прапагандысты выкарыстоўвалі гутаркі, лекцыі, сходы, друкаваныя газеты і лістоўкі. Сярод партызан і насельніцтва раёна папулярнымі былі газеты “Палеская праўда” Пінскага падпольнага абкома КП(б) Б і “Партизан Полесья”, якую выдаў Іванаўскі падпольны РК КП (б)Б. Газета “Палеская праўда” пачала выходзіць з мая 1943 года 2 разы на тыдзень тыражом 120-130 экзэмпляраў.


Палеская праўда

Мужнасць і гераізм многіх партызан былі прыкладам для іншых. Аб іх пісалі ў газетах і лістоўках, аб іх складалі вершы і песні. Баявыя ўзнагароды знаходзілі самых дастойных. Іх уручалі ва ўрачыстай абстаноўцы. Партызаны з гонарам успрынялі прысваенне звання Героя Савецкага Саюза камандзірам злучэння Васілію Захаравічу Каржу і Аляксею Яфімавічу Кляшчову.

На тэрыторыі Пінскага раёна праходзілі чыгуначныя лініі. На ўчастках чыгункі Пінск – Іванава, Пінск – Лунінец, Лунінец – Баранавічы партызаны праводзілі баявыя аперацыі. Так, партызаны Пінскай брыгады з верасня 1943 г. па май 1944 г. разбурылі 2,8 км чыгуначнага палатна, знішчылі 21 мост, пашкодзілі 27,5 км тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Партызаны брыгады В.У.Куйбышава падарвалі 580 рэек, знішчылі 32 аўтамашыны, 7 мастоў на чыгунцы і 74 на шашэйных і грунтавых дарогах.

Партызаны грамілі варожыя гарнізоны, апорныя пункты ў вёсках Добрая Воля, Дубай, Крамна, Патапавічы, Яромічы, Радастава, Оўзічы, Лахвічы і іншыя. У выніку актыўных дзеянняў партызан пад іх кантролем аказаліся значныя тэрыторыі, на якіх ствараліся партызанскія зоны. Яны былі базай і фарпостам партызан, ядналі ў адзіны баявы лагер народных мсціўцаў і насельніцтва. Стварэнне такой зоны на стыку Мінскай, Пінскай і Палескай абласцей палажыў праведзены ў канцы 1942 г. па ініцыятыве В.З.Каржа першы партызанскі рэйд па васьмі раёнах.

Гэта была адна з 20 зон, якія ахоплівалі да 60% тэрыторыі рэспублікі. У партызанскіх зонах аднаўлялася савецкая ўлада. Яе дзеючымі органамі былі партызанскія атрады, падпольныя партыйныя органы, створаныя партызанамі камендатуры, адноўленыя сельскія Саветы. Вясной 1943 г. аднавілі работу Лемяшэвіцкі сельсавет з цэнтрам у в.Хлябы і Дубайскі з цэнтрам у в. Кончыцы.

Толькі ў зоне дзеянняў брыгады імя В.М.Молатава, якая да восені 1943 года кантралявала 73 вёскі, былі адноўлены 9 сельскіх Саветаў. Партызаны прымалі актыўны ўдзел у іх рабоце. У партызанскіх зонах вырашаліся пытанні веснавой сяўбы, уборкі ўраджаю і яго размеркаванне, дапамогі партызан насельніцтву, аховы ад карнікаў, стварэння рэзерву для папаўнення атрадаў.

Усё гэта не магло не турбаваць гітлераўцаў. Да таго ж, да Піншчыны наблізілася лінія фронту. Таму праціўнік вырашыў ачысціць свой тыл ад партызан, не даць ім аб’яднацца з наступаючымі савецкімі войскамі, узяць пад свой кантроль чыгунку і шашу Брэст – Гомель, якія праходзілі праз тэрыторыю Пінскага раёна.

Жорсткія баі разгарнуліся за Дняпроўска-Бугскі канал. 15 тысяч карнікаў павялі наступленне на партызанскую зону, імкнучыся ўтрымаць канал пад сваім кантролем. Ім працістаялі партызанскія атрады і брыгады, якія дзейнічалі на тэрыторыі Драгічынскага, Іванаўскага і Пінскага раёнаў. У лютым – сакавіку 1944 года партызаны 42 дні стрымлівалі націск карнікаў. Баі ішлі з пераменным поспехам: на адных участках абароны партызанам пад ударамі пераўзыходзячых сіл карнікаў даводзілася адступаць, на іншых – утрымліваць свае пазіцыі і пераходзіць у наступленне. Гітлераўцы штодзень бамбілі пазіцыі партызан, абстрэльвалі з гармат. У тыле ворага дзейнічалі дыверсійныя групы У.Леанчука, С.Прыступы, І.Качаліна. Яны падрывалі варожыя эшалоны і аўтамашыны, напалі на нямецкія пасты. Партызаны абстралялі самалёты і ўзарвалі склад з боепрыпасамі на Жабчыцкім аэрадроме.

Адступленне праціўніка водным шляхам было сарвана. 120 кіламетраў канала на ўчастку Пінск – Кобрын сталі непраходнымі. У выніку 185 рачных суднаў засталіся ў Пінску і былі захоплены наступаючымі савецкімі войскамі. Баі партызан Прыпяцкай зоны паказалі іх сілу. Вораг панёс значныя страты.

Не дасягнулі карнікі поспеху ў аперацыі супраць партызан, якія дыслацыраваліся на поўначы вобласці – брыгад імя С.М.Будзённага і С.М.Кірава. У цяжкіх баях партызаны адстаялі свае пазіцыі.

Баі з карнікамі працягваліся і ў маі. Але гэта ўжо быў час, калі да граніцы вобласці наблізіліся савецкія войскі. Перад партызанамі сталі новыя задачы – аказаць максімальную дапамогу Чырвонай арміі. Набліжаўся час вызвалення.

# Вызваленне г.Пінска і Пінскага раёна

У пачатку ліпеня 1944 г. войскі 1-га Беларускага фронту наблізіліся да Піншчыны. Наперадзе іх чакалі жорсткія баі. У цяжкапраходных Пінскіх балотах, поймах рэк Прыпяці, Піны і Ясельды гітлераўцы стварылі моцную лінію абароны, горад Пінск ператварылі ў непрыступную крэпасць.

У вызваленні Пінскага раёна ўдзельнічалі войскі 28-й і 61-й армій, Дняпроўская ваенная флатылія. Ім дапамагалі партызаны: вялі разведку, складалі планы варожых умацаванняў, захоплівалі і ўтрымлівалі да падыходу савецкіх войск важныя аб'екты.

Войскі 164,166 і 168 палкоў 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі



Парад партызан у вызваленым Пінску.
21 ліпеня 1944 г.

фарсіравалі Ясельду ў раёне в.Купяцічы, 397-я стралковая дывізія 61-й арміі - раку Стыр каля в. Вуйвічы. 447-ы стралковы полк гэтай дывізіі авалодаў в. Беразцы. Ім дапамагаў дэсант маракоў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, які высадзіўся тут напярэдадні. Паспяхова дзейнічаў 416 стралковы полк. Разам з суседнімі часцямі ён падавіў супраціўленне ворага на рубяжы Вуйвічы - Гальцы, фарсіраваў Стыр, затым Прыпяць у раёне в. Асабовічы. Цяжка даводзілася артылерыстам. Гарматы, баепрыпасы яны пераносілі літаральна на сваіх плячах. Пераадолеўшы ўсе цяжкасці, савецкія воіны ўварваліся ў в. Селішча і рушылі да станцыі Парахонск на чыгунцы Лунінец - Пінск. На чыгуначных і шашэйных камунікацыях гітлераўцы аказвалі найбольш упартае супраціўленне. Таму на гэтым напрамку і былі сканцэнтраваны 397, 55 і 23-я стралковыя дывізіі 61-й арміі, 55-я Іркуцкая дывізія 28-й арміі. Іх падтрымлівалі караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Наступленне савецкіх войскаў ішло паспяхова.

10 ліпеня 397-я дывізія выбіла рэшткі праціўніка са станцыі Парахонск, асноўныя сілы якога за тры дні да гэтага разграмілі партызаны. Адсюль шлях дывізіі пралягаў на захад, у раён Стараселле - Вылазы. Ужо раніцай 11 ліпеня часці дывізіі занялі зыходныя пазіцыі для фарсіравання Ясельды. На правым флангу ад яе падрыхтавалася да фарсіравання ракі 55-я Іркуцкая дывізія, далей, каля Вулькі Гарадзішчанскай, 55-я Мазырская дывізія. На поўначы раёна, вызваляючы населенныя пункты, у напрамку Пінска прасоўвалася 23 стралковая дывізія. Ёй аказвалі дапамогу партызаны. Яны адбівалі шматлікія атакі праціўніка ў раёне Цвярдоўка - Альшанка - Парэчча, быў разбіты варожы эскадрон, захоплены вялікія трафеі. 13 ліпеня 200 партызан пад покрывам ночы фарсіравалі Ясельду і нанеслі ўдар па батарэях ворага ў раёне в.Халажын.

На поўдні раёна дзейнічала 12, 212 і 415-я стралковая дывізіі. 10 ліпеня 1-й брыгадай бранякатэраў быў дэсант партызан- разведчыкаў з 60 чалавек у вёсках Плошчава і Качановічы. Перад імі была пастаўлена задача весці разведку і пры падтрымцы караблёў захапіць плацдарм у прыбярэжнай зоне.

Ужо 11 ліпеня байцы 415-й стралковай дывізіі пры падтрымцы караблёў флатыліі вызвалілі вёскі Шаломічы, Лосічы, Тупчыцы, Хрысцібаловічы, Балгары, Лемяшэвічы. Адзінай перашкодай на шляху да Пінска па Прыпяці заставалася в.Церабень, але і яна да ночы была вызвалена. 12 ліпеня, фарсіраваўшы Ясельду, рушылі да Пінска воіны 397-й, 55-й Іркуцкай і 55-й Мазырскай дывізій. На правым беразе завязаліся жорсткія баі. Левы фланг 397-й дывізіі на ўчастку Гарадзішча-Пінкавічы падтрымлівала брыгада бранякатэраў (камандзір В. М. Нікіцін).

У гэты ж дзень адзін з бранякатэраў, якім камандаваў Р. Аронс, высадзіў дэсант каля в. Почапава. Маракоў сустрэў моцны агонь варожых батарэй, але яны мужна адбіваліся. Асабліва вызначыліся байцы І. Юнусаў, К. Рабакрыс, І. Махонін, М. Пастухоў і іншыя. Некалькі варожых снарадаў трапілі ў бранякатар і падпалілі яго. Десант выканаў сваю баявую задачу: садзейнічаў паспяховаму наступленню нашых войскаў на Пінск і разгрому умацаванага пункта абароны праціўніка ў в.Почапава.

Другі дэсант у колькасці 200 чалавек зламаў супраціўленне ў в. Пінкавічы. Шлях на Пінск быў адкрыты. 3 баямі фарсіравалі савецкія войскі Ясельду. 55-я Іркуцкая дывізія павяла наступленне ў раён в. Купяцічы. Перадавыя падраздзяленні 168-га і 166-га палкоў завязалі баі на правым беразе ракі. На дапамогу пехацінцам прыйшлі артылерысты 62-га асобнага знішчальнага праціватанкавага дывізіёна, якім камандаваў маёр Ц.І.Калінін. Па яго загаду ўсе гарматы былі пастаўлены на прамую наводку.

Да адной з іх стаў сам камандзір і падбіў некалькі танкаў. Яго прыклад натхніў байцоў. Некалькі разоў фашысты спрабавалі контратакаваць гвардзейцаў, але безвынікова. 13 ліпеня ўся дывізія згрупавалася на правым беразе Ясельды. У баях за гэты плацдарм загінуў Ц.І.Калінін. Пасмяротна ён быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

З гэтага плацдарма палкі 55-й Іркуцкай дывізіі, прарваўшы абарону праціўніка на поўдні і на захадзе ад в.Купяцічы, ноччу 14 ліпеня падышла да ўскраіны Пінска. 55-я Мазырская дывізіія 61-й арміі, якая знаходзілася на левым флангу 55-й Іркуцкай дывізіі 28-й арміі, фарсіравала Ясельду ў напрамку в. Аснежыцы. Супраць 111-га стралковага палка, які наступаў наперадзе дывізіі, фашысты распачалі танкавую контратаку. Начальнік штаба палка Ф. М. Яравой успамінаў аб тых баях: “Нашы бранябойшчыкі Веньямін Ізмадзенаў і Міхаіл Свірыдзенка падбілі процітанкавай стральбой адзін «тыгр», ён закруціўся на адной гусеніцы, уздымаючы пласты зямлі, спыніўся і ўзарваўся. Чорны едкі дым зацягнуў навакολле. Астатнія танкі праскочылі баявыя парадкі і памчаліся ў напрамку чыгункі. Пяхоту немцаў моцным агнём сустрэлі нашы воіны. Парторг роты Фёдар Авечкін падняў байцоў у штыкавую атаку на напаўп'яных гітлераўцаў. Фашысты былі вымушаны ўцякаць. Дабівалі іх трапным агнём байцы роты. «Тыгры», пазбавіўшыся падтрымкі пяхоты, спешна пачалі адыходзіць да горада».

З поўдня да Пінска з баямі прабіваліся 12-я і 212-я стралковыя дывізіі, якія ўваходзілі ў склад 9-га стралковага корпуса 61-й арміі. Ноччу 10 ліпеня 29-ы стралковы полк 12-й стралковай дывізіі фарсіраваў Прыпяць у трох кіламетрах ад в. Вялікія Дзіковічы і захапіў невялікі плацдарм на яе левым беразе. Амаль тры дні ішлі жорсткія баі за гэты невялікі кавалачак зямлі. Толькі на наступны дзень, атрымаўшы дапамогу, полк уварваўся ў вёску. Спробы фашыстаў адбіць яе не прынеслі поспеху, нягледзячы на 30 контратак.



Нямецкі танк, падбіты ў ваколіцах Пінска

Савецкія войскі працягвялі наступленне. 13 ліпеня яны авалодалі населенымі пунктамі Месткавічы, Іванікі, Малая Вулька, Хойна, Стайкі і Жыдча.

На правым флангу 12-й дывізіі да Пінска праз вёскі Лапацін, Марозавічы, Плешчыцы рухалася 212-я дывізія, якая 13 ліпеня фарсіравала Прыпяць у раёне вёсак Сачкавічы - Стытычава.

Разам яны выйшлі да ракі Піна. Для праціўніка была створана пагроза акружэння. Ён пачаў адыходзіць з Пінска. Яго праследавалі абедзве дывізіі разам з падраздзяленнямі 9-га стралковага корпуса.

На поўнач ад Пінска заставаўся яшчэ адзін варожы фарпост - Лагішын. 9 ліпеня пад покрывам ночы партызаны 208-га партызанскага палка атакавалі яго гарнізон. Пасля жорсткага бою, нягледзячы на яўную перавагу фашыстаў, яны здолелі прарвацца да цэнтра пасёлка. Але раніцай да немцаў падышло падмацаванне і партызаны вымушаны былі адступіць. 15 ліпеня часці 23-й стралковай дывізіі 61-й арміі разам з партызанамі вызвалілі гарадскі пасёлак Лагішын.

Загінуўшыя ў час вызвалення раёна і горада Пінска пахаваны ў брацкіх магілах. Сярод іх Героі Савецкага Саюза Ц.І. Калінін і А.Ц. Кулікаў.

Шмат ўраджэнцаў Пінскага раёна прайшлі дарогамі вайны. Адны загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, іншыя - вярнуліся пераможцамі.

75 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

*Піншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны*

**Рэдактар А.І.Анташук**
**Складальнік В.І.Жылевіч**
**Камп'ютарная вёрстка К.Л.Міхалевіч**

**225710**
**г. Пінск**
**Тэл.: 31 60 15, факс 31 61 36**
**Эл. пошта: crbpinsk@tut.by**